Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57

DOI:10.17951/sb.2024.18.121-139
Studia Białorutenistyczne 18/2024 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Maryia Martysevich

National Academy of Sciences of Belarus, Minsk (Belarus)
e-mail: maryjka.m@gmail.com
https://orcid.org/0009-0006-0846-1743

# Жанравы кантынуум ананімнай бурлескна-травестыйнай паэмы ў беларускай літаратуры XIX–XXI стагоддзяў: асаблівасці ўзнікнення і развіцця

*The Genre Continuum of the Anonymous Burlesque-travesty Poem in Belarusian Literature of the 19th–21st Centuries: Features of its Origin and Development*

*Kontinuum gatunkowe anonimowego poematu burleskowo-parodyjnego w literaturze białoruskiej XIX–XXI wieku: cechy powstania i rozwoju*

**Abstract**

The article is devoted to the study of the genre continuum of a burlesque-travesty poem (BTP) in the Belarusian poetry of the 19th – early 21st centuries. The main goal of the study is to determine the role of BTP in the process of shaping modern Belarusian literature, based on the hypothesis that the role of BTP in this process was fundamental: if the works of the 19th century actually formed the foundation of the Belarusian literary process, then later texts contributed to its reformatting in the context of the new literary situation of the late 20th and early 21st centuries. The study is based on a comparative-typological analysis of five texts from different times, which the author of the article attributes to the BTP genre: *Ѐneida navyvarat* (*Aeneid Inside Out*), *Taras na Parnase* (*Taras on Parnassus*), *Skaz pra Lysuû Garu* (*The Tale of the Bald Mountain*), *Luka Mudziščaй – Prezident* (*Luka Mudishchev the Prezident*) and *Zianon-Hop*. The relevance of the research lies in the fact that the epic works mentioned above are considered comprehensively as elements of one genre system; the article introduces the definition of „genre continuum" – a sum of texts that are similar in form and content, united by a plot, which are often a free translation of a work of a neighbouring culture or an imitation of earlier works of national culture. Based on this analysis, the main features of BTP genre within national culture are identified, namely anonymity, virality, variability, grotesqueness, political involvement, ambivalence and meta-irony. In addition, a special table shows the dynamics of „high / old" and „low / new" codes of five texts, on this basis conclusions

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



are drawn about the evolution of the picture of the world of intellectual elites of Belarus in the last two centuries. Under the influence of the cultural-historical method, it is noted that, despite the existence of this or that text in the worldview system of its time, BTP remained inert to literary influences, being on the one hand a product of the socio-cultural situation, and on the other – an invariant of a hermetic genre continuum.

**Keywords**: burlesque-travesty poem, genre continuum, anonymous poetry, parody, grotesque

**Abstrakt**

Artykuł został poświęcony analizie tradycji gatunkowej poematu o charakterze burleski i trawestacji (BTP) w poezji białoruskiej w okresie od XIX do początku XXI wieku. Głównym celem badania było określenie roli tego poematu w procesie kształtowania się współczesnej literatury białoruskiej. Znaczenie analizowanej formy gatunkowej było tu fundamentalne: o ile dzieła XIX-wieczne stanowiły zaledwie podwaliny białoruskiego procesu literackiego, o tyle teksty późniejsze dowodzą jego ewolucji w nowej sytuacji literackiej końca XX–początku XXI wieku. Materiałem źródłowym jest pięć datowanych na różne okresy tekstów: *Èneida navyvarat* (*Eneida nawspak*), *Taras na Parnase* (*Taras na Parnasie*), *Skaz pra Lysuû Garu* (*Opowieść o Łysej Górze*), *Luka Mudziščaŭ – Prezydent* (*Łuka Mudiszczew Prezydentem*) oraz *Zianon-Hop*. Badane utwory są analizowane wieloaspektowo jako elementy jednego systemu gatunkowego; w artykule wprowadzono definicję *kontinuum gatunkowego* – zbioru tekstów o podobnej formie i treści, połączonych fabułą, będących często swobodnym tłumaczeniem dzieła sąsiedniej kultury lub imitacją wcześniejszego dzieła kultury ojczystej. Na podstawie analizy zidentyfikowano główne cechy analizowanego gatunku w ramach kultury narodowej (takie jak anonimowość, wirusowość, zmienność, groteskowość, zaangażowanie polityczne, ambiwalencja i metaironia), przedstawiono dynamikę „wysokiego/starego" i „niskiego/nowego" kodu pięciu tekstów (na podstawie której wyciągane są wnioski na temat ewolucji obrazu świata elit intelektualnych Białorusi w ostatnich dwóch stuleciach). Badanie dowiodło, że pomimo istnienia każdego tekstu w ówczesnym systemie światopoglądowym, poemat o cechach burleski i trawestacji pozostawał obojętny na wpływy literackie, będąc z jednej strony wytworem sytuacji społeczno-kulturowej, a z drugiej inwariantem hermetycznego kontinuum gatunkowego.

**Słowa kluczowe**: wiersz burleskowo-trawestacyjny, kontinuum gatunkowe, poezja anonimowa, parodia, groteska

**Анатацыя**

Артыкул прысвечаны даследаванню жанравага кантынуума бурлескна-травестыйнай паэмы (БТП) у беларускай паэзіі XIX – пачатку XXI стст. Асноўная мэта даследавання – вызначэнне ролі БТП ў працэсе фармавання беларускай літаратуры Новага часу, з апорай на гіпотэзу, што роля БТП у гэтым працэсе была фундаментальнай: калі творы XIX ст. фактычна склалі падмурак беларускамоўнага літпрацэсу, то пазнейшыя тэксты спрычыніліся да яго перафарматавання ў кантэксце Новай літаратурнай сітуацыі канца XX – пачатку XXI ст. Даследаванне грунтуецца на параўнальна-тыпалагічным аналізе пяці

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



тэкстаў рознага часу, якія аўтарка артыкула адносіць да жанру БТП: *Энеіда навыварат*, *Тарас на Парнасе*, *Сказ пра Лысую Гару*, *Лука Мудзішчаў – прэзідэнт* і *Зянон-Хоп*. Актуальнасць даследавання палягае на тым, што згаданыя эпічныя творы разглядаюцца комлексна, як элементы адной жанравай сістэмы; у артыкуле ўводзіцца азначэнне „жанравага кантынууму" – сумы блізкіх па форме і змесце тэкстаў, аб'яднаных сюжэтам, якія часта з'яўляюцца вольным перакладам твора суседняй культуры ці перайманнем ранейшага твора айчыннай культуры. На падставе гэтага аналізу вызначаюцца асноўныя рысы жанру БТП у рамках нацыянальнай культуры, а менавіта ананімнасць, віруснасць, варыятыўнасць, гратэскавасць, палітычная ангажаванасць, амбівалентнасць і метаіранічнасць. Апроч таго, у спецыяльнай табліцы адлюстраваная дынаміка „высокага / старога" і „нізкага / новага" кодаў пяці тэкстаў, на падставе якой робяцца высновы пра эвалюцыю карціны свету інтэлектуальных элітаў Беларусі ў апошнія два стагоддзі. Пад уплывам культурна-гістарычнага метаду адзначаецца, што, нягледзячы на бытаванне кожнага тэксту ў светапогляднай сістэме свайго часу, БТП заставаліся інертнымі да літаратурных уплываў, будучы з аднаго боку – прадуктам сацыякультурнай сітуацыі, а з іншага – інварыянтам герметычнага жанравага кантынууму.

**Ключавыя словы**: бурлескна-травестыйная паэма, жанравы кантынуум, ананімная паэзія, пародыя, гратэск

## Уводзіны

Бурлескна-травестыйная паэма (БТП) – знакавы жанр для беларускай літаратуры на яе мадэрным этапе (ад пачатку XIX ст. да нашых дзён). Сёння традыцыя жанру БТП у новай і найноўшай беларускай літаратуры налічвае шэраг арыгінальных тэкстаў, кожны з якіх мае шлейф пародый, працягаў, перайманняў. У рамках дадзенай працы былі пастаўленыя мэты на прыкладзе пяці тэкстаў, якія ўтвараюць бурлескна-травестыйны жанравы кантынуум беларускай літаратуры Новага часу: 1) прасачыць паўстанне і развіццё жанру БТП у беларускай літаратуры ад пачатку XIX ст. да пачатку XXI ст. у суаднясенні з працэсам узнікнення і развіцця самой нацыянальнай літаратуры: ад рамантызму і пазітывізму – праз рэалізм і сацрэалізм – да мадэрнізму і постмадэрнізму і 2) вызначыць жанравыя асаблівасці беларускага варыянту БТП на сучасным этапе. Дзеля гэтага былі пастаўленыя задачы: 1) прааналізаваць генезіс, структуру і бытаванне кожнага з пяці твораў у кантэксце еўрапейскага жанравага кантынуума БТП па стандартнай схеме, у тым ліку вызначыўшы ў структуры кожнага тэксту „стары = высокі" код (тое, што высмейваецца аўтарам той ці іншай паэмы) і „новы = нізкі" код (тое, з дапамогай чаго высмейваецца „старое = высокае", і што такім чынам аўтар паэмы робіць суб'ектам літаратуры), і акрэсліўшы дамінантна-рэцэсіўныя дачыненні паміж гэтымі кодамі для кожнага тэксту; 2) сістэматызаваць сабраны матэрыял у выглядзе табліцы; 3) вызначыць на яго падставе асноўныя рысы бурлескна-травестыйнай паэтыкі ў мадэрнай

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



беларускай літаратуры, а таксама ролю жанра БТП ў развіцці беларускай літаратуры Новага часу.

## 1. Жанравы кантынуум БТП: спроба дэфініцыі

БТП разглядаецца ў айчынным вершазнаўстве як падвід жанру паэмы: так у адным са сваіх тэрміналагічных тэзаўрусаў яе класіфікуе Вячаслаў Рагойша, які адзначае, што гэтым падажанрам „распачыналася новая беларуская літаратура", прыводзячы як прыклад БТП творы *Энеіда навыварат* і *Тарас на Парнасе* (Ragojša, 2004, s. 348). Як сінанімічны для БТП В. Рагойша выкарыстоўвае тэрмін бурлеска, вылучаючы два яе падвіды: травестыю, калі „пра высокае, узвышанае гаворыцца наўмысна будзённа, падчас нават груба, вульгарна" і іраікамедыю, калі „самыя будзённыя з'явы, рэчы апісваюцца высокім стылем, з патэтыкай, пафасам" (Ragojša, 2009, s. 31).

Ва ўсходнеславянскай літаратуры жанры бурлескі і травестыі сталі пашырацца з сярэдзіны XVIII ст., перавандраваўшы ў наш арэал разам з класіцыстычным канонам. У 1791–1796 гг. Мікалай Осіпаў надрукаваў 4 песні *Энеиды, вывороченной наизнанку*, якія, найверагодней, ёсць вольным перакладам *Virgils Aeneis travestirt* аўстрыйца Алаіза Блюмаўэра (1780-я).

Абапіраючыся на еўрапейскую традыцыю травестацыі Вергілія, стварае сваю *Энеіду* (1798) Іван Катлярэўскі. Паэма, паводле розных даследчыкаў, стала лёсавызначальнай для фармавання ўкраінскай нацыі як твор, які пачаў новую ўкраінскую літаратуру (Pavlično, 2002, s. 626; Anderson, 2006, p. 74).

Да еўрапейскай традыцыі травестацыі Вергілія належыць і беларускі твор *Энеіда навыварат*, які, у сваю чаргу, пачаў самастойную традыцыю ў кантэксце мадэрнай беларускай літаратуры, утварыўшы ў яе каноне своеасаблівы жанравы кантынуум БТП, які мы вызначаем як суму блізкіх па форме і змесце тэкстаў, аб'яднаных сюжэтам, якія часта з'яўляюцца вольным перакладам твора суседняй культуры ці перайманнем ранейшага твора ўласнай культуры. Паспрабуем апісаць гэты кантынуум на аснове пяці ключавых тэкстаў, якія паўсталі ў XIX, XX і XXI стст.

## 2. Ананімныя БТП у беларускай літаратуры XIX–XXI стст.

### *2.1. Энеіда навыварат*

БТП *Энеіда навыварат* была створаная, як мяркуецца, паміж 1812 і 1837 гг. Сацыяльна-палітычныя рэаліі, згаданыя ў паэме, дазволілі даследчыку беларускай літаратуры Генадзю Кісялёву звузіць часавы адцінак напісання

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



паэмы да 1820-х гг. (Kisâlëŭ, 1993, s. 353). Дзякуючы аргументам Г. Кісялёва сёння прынята лічыць, што найбольш верагодны аўтар паэмы – смаленскі памешчык Вінцэнт Равінскі, хоць гэтая версія дагэтуль аспрэчваецца[1].

Паэма захавалася не цалкам. Найбольш поўны знойдзены рукапіс налічвае 303 радкі (Haŭstovič, 2004). Сюжэт паэмы паўтарае сюжэт I песні *Энеіды* Вергілія і, адпаведна, I песні *Энеіды* М. Осіпава і І. Катлярэўскага: Эней са спадарожнікамі пакідае Трою, але праз козні Юноны трапляе да царыцы Дыдоны ў Карфаген:

Цяпер завернець к Карпагені
(Ў Дыдоны, відзіш, талака),
Папрэ уволю ён смажэні,
Ад'есца з добрага быка,
Папарыцца ён там у бані,
Падпусціць хвігля самай пані,
Закруціць моцна галаву –
На любжу прывядзе ўдаву (Aleksandrovìč, 1971, s.11).

Беларускі варыянт травеставанай *Энеіды* сведчыць пра дэмакратычныя погляды яе аўтара, бо адлюстроўвае мары тагачаснага прагрэсіўнага двараніна пра рэформу расійскай манархічнай сістэмы: Эней мусіць „даперці да Рыму" і заснаваць дзяржаву, дзе „паны не будуць багаты". Паэма цыркулявала пераважна ў вуснай форме, пакуль у 1845 г. не адбылася першая публікацыя ў газеце „Смоленский вестник", таму, на нашу думку, можа разглядацца ў адным кантэксце з беларускамоўнай сацыяльнай паэзіяй XIX ст.

Асобна трэба адзначыць, што поруч з дэталямі побыту заможнага беларускага селяніна ў якасці „нізкага" коду у беларускай *Энеідзе*, як і ва ўкраінскім варыянце выступае выкарыстанне беларускай мовы (яе віцебска-смаленскага варыянту).

### *2.2. Тарас на Парнасе*

У 1855 г. была створаная паэма *Тарас на Парнасе*, якая займела міжсаслоўную папулярнасць на беларускіх землях Расійскай імперыі: яе чыталі, цытавалі

[1] Прааналізаваўшы строфіку ананімнай паэмы, Мікола Хаўстовіч прыходзіць да высновы, што паэма напісаная значна раней за 1820-я гг, „напрыканцы XVIII — напачатку XIX стст. як непасрэдны водгук на з'яўленне *Энеід* М. Восіпава і І. Катлярэўскага [...] у час шырокага выкарыстання ў расійскім вершаванні адычнай страфы" (Haŭstovič, 2004, s. 48). Паводле М. Хаўстовіча, паэма дайшла да нашага часу ў „сапсаваным" выглядзе і першапачаткова была напісаная ўласцівай жанру БТП адычнай страфой (дэцымай ababccdeed). У працэсе перапісвання, вуснага бытавання і пэўнай фальклярызацыі ператварылася ў катрэны, напісаныя 4Я.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



і перапісвалі і шляхта, і мяшчане, і сяляне. Першая публікацыя паэмы адбылася ў 1889 г. у Віцебску. Доўгі час у айчыннай тэксталогіі твор разглядаўся як ананімны, але на сёння яго аўтарам афіцыйна лічыцца Канстанцін Вераніцын. Як мяркуецца, К. Вераніцын стварыў паэму ў 20-гадовым узросце, калі паміж вучобай у Санкт-Пецярбургу і Горы-Горыцкай акадэміі жыў у родным Гарадку.

Паводле сюжэта паэмы палясоўшчык Тарас падчас абходу лесу сустракаецца з мядзведзем і падае ў яму, пасля чаго трапляе ў іншасвет – да гары Парнас. Ён назірае, як на гару да вечнай славы ўздымаюцца расійскія літаратары папярэдняй эпохі: Пушкін, Гогаль, Жукоўскі і Лермантаў, у той час як „рэакцыйным” пісьменнікам Булгарыну і Грэчу ў пад’ёме на Парнас адмоўлена. Тарас таксама ўздымаецца на гару, дзе багі жывуць жыццём пастаральнай беларускай вёскі. Герой удзельнічае ў бяседзе і танцах. У выніку, ягонае падарожжа на Парнас аказваецца сном (Aleksandrovìč, 1971, s. 17–25).

Паэма мае фармальную сувязь з *Энеідай навыварат*, яна напісаная катрэнамі abab, чатырохстопным ямбам, што на той час успрымалася як канон жанру БТП, мае прамую цытату з *Энеіды*.... Міфічная гара Алімп, на якой жывуць багі, трансфармуецца ў Парнас, што адлюстроўвае адну з гарачых тэм інтэлектуальных асяродкаў Расійскай імперыі сярэдзіны XIX ст. Расійская літаратура перажывала фармаванне канону, у крытыцы актыўна абмяркоўвалася, хто мае, а хто не мае права застацца „ў вечнасці”. Для нашага кантэксту важна, што на Парнас у сне Тараса падымаюцца не толькі новыя класікі расійскай літаратуры, але і беларускі селянін:

Праміж людзей і я штурхаўся
І ціснуўся, што ёсць пары;
Вось чуць-не-чуць такі прабраўся
І лезу проста да гары (Aleksandrovìč, 1971, s. 20).

Валянціна Сакалова ў якасці адной з магчымых першакрыніц паэмы называе фельетон з расійскага афіцыёзнага выдання „Невский зритель” *Видение на Парнасе* (1820-я гг.), у якім багі выкідаюць з Парнаса „маларасійскіх пісьменнікаў” (Sokolova, 2011, s. 328). Аўтар *Тараса на Парнасе*, такім чынам, пярэчыць тагачаснай грамадскай думцы, паказваючы, што беларускі ці ўкраінскі селянін таксама можа быць літаратурным героем, суб’ектам, а не аб’ектам літаратуры – няхай пакуль як герой бурлескнага твору.

### *2.3. Сказ пра Лысую Гару*

Жанр паэтычнай травестыі актуалізаваўся ў XX ст. у ананімнай самвыдаў-паэме *Сказ пра Лысую Гару* (1971–1975), першыя машынапісныя копіі якой былі падпісаныя псеўданімам Францішак Вядзьмак-Лысагорскі. Паэма цыркулявала ў машынапісных аркушах у 1970-я і 1980-я гг. Яе сюжэт – чарговая гульня

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



з топасам Парнаса, у якасці якога ў паэме выступае Лысая Гара – адсылка да рэальнай мясцовасці пад Мінскам, дзе ў канцы 1960-х гг. поруч з іншымі савецкімі служачымі атрымалі ўчасткі пад дачы савецкія пісьменнікі, рэдактары, выдаўцы і іншыя літаратары – сябры Саюза пісьменнікаў БССР. Паэма мае ў сабе рысы фельетону, літаратурнага анекдоту, шаржу і іншых праяў „дазволенай" савецкай сатыры. Аднак мы вызначаем жанр БТП як асноўны для гэтага тэксту, а гратэск – яе даміноўным пафасам. Так, вытрымліваючы дваіста-антаганічны канон бурлеску, дзеля сутыкнення „высокага" і „нізкага" кодаў, аўтар іранічна апісвае побыт пісьменнікаў (умоўных жыхароў Парнаса), якія замест таго, каб ствараць узнёслыя літаратурныя творы, як таго вымагалі каноны афіцыйнай савецкай літаратуры, займаюцца прыземленымі, мяшчанскімі рэчамі: будуюць дамы, садзяць агароды. Асаблівай увагі як ілюстрацыя „зніжальнага коду" заслугоўвае раздзел *Праблема*, дзе падрабязна апісваецца, якім чынам літаратары здабываюць угнаенне для градак:

– Абы дзярмо! – аднойчы ўвечар
Сказаў Няхай і тут жа скіс.
Але паэту запярэчыў
Празаік Сачанка Барыс.
– Ну, не кажыце: гной нявоўны.
Найлепшы той, што зробіш сам.
Бо ён жа твой, уласны, кроўны,
Як твор, які ты напісаў (Vâdz′mak Lysagorski, 1988, s. 20).

Фармальна „*Сказ...*" паўтарае „*Энеіду...*" і *Тараса на Парнасе* (Я4, катрэны abab).

Першая публікацыя паэмы адбылася ў 1988 г. у бібліятэчцы часопіса „Вожык" у няпоўным варыянце – тады, калі твор быў ужо добра вядомым, любімым і часта цытаваным як у асяродках беларускай гуманітарыстыкі так і „простым чытачом". У 2003 г. народны пісьменнік Беларусі Ніл Гілевіч афіцыйна абвясціў пра сваё аўтарства, апублікаваўшы новую рэдакцыю паэмы асобным выданнем пад сваім іменем (Gilevič, 2003). Нягледзячы на гэта, пытанне аўтарства *Сказу пра Лысую Гару* на нашу думку, яшчэ патрабуе ўдакладненняў, паколькі актыўны ўдзел у стварэнні паэмы прымаў Мікола Аўрамчык (Gilevič, 2007).

### *2.4. Лука Мудзішчаў – прэзідэнт*

*Сказ пра Лысую Гару*, будучы самым папулярным, „вірусным" творам непадцэнзурнай беларускай літаратуры савецкага перыяду (Astroŭskaâ, 2022, s. 166), у сваю чаргу спарадзіў шмат пародый, перайманняў, працягаў і г. д., спрычыніўшыся да традыцыі ананімнай паэзіі сярэдзіны 1990-х. У тым ліку – да з'яўлення ананімнай сатырычнай паэмы *Лука Мудзішчаў – прэзідэнт*,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



падпісанай псеўданімам „Вядзьмак Лысагорскі”. Гэты тэкст меў выразную інтэртэкстуальную сувязь з усходнеславянскай бурлескнай традыцыяй і гэтак жа быў успрыняты чытачамі. Лука Мудзішчаў – травестыйны персанаж расійскай ананімнай „срамной” паэмы XIX ст., якая належыць да „псеўдабаркавіяны” рускай літаратуры XIX ст. (гэты твор прыпісваюць Івану Баркову) (Barkov, 1969). Па сугуччы з прозвішчам палітыка беларускі Лука выступае травеставаным вобразам прэзідэнта, абранага на першых дэмакратычных выбарах незалежнай Беларусі ў 1994 г. Асноўная праблема, якую закранае паэма, – моўнае пытанне: аўтар асуджае стаўленне нядаўна абранага прэзідэнта да беларускай мовы.

Першая палова паэмы (27 строф) была надрукаваная ў газеце „Свабода” (Vâdz′mak Lysagorski, 1994) накладам у 90 тыс. Нумар 1 газеты „Свабода” за 1995 г., дзе надрукавалі 27 строф з другой часткі, не з’явіўся ў шапіках „Белсаюздрук” праз забарону Адміністрацыі прэзідэнта, а таксама не дайшоў да чытача праз афіцыйныя каналы падпіскі (*Čamu Lukašènka baicca svabodnaj prèsy*, 1995). Нумары з паэмай цыркулявалі па неафіцыйных каналах і пазней – у ксеракопіях. Імя аўтара дагэтуль невядомае – верагодна, таму, што і сёння ягоны твор можа быць расцэненым паводле арт. 367 дзейнага КК РБ як паклёп на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або паводле арт. 368 як абраза прэзідэнта (*Ugolovnyj kodeks Respubliki Belarus'*, 1999).

Паэму *Лука Мудзішчаў...*, напісаную ў канвенцыі літаратуры беларускага адраджэння 1990-х гг., паводле пафасу належыць адносіць хутчэй да сатыры: гэта вершаваны памфлет. З беларускай традыцыяй БТП яе аднак звязвае не толькі псеўданім ананімнага аўтара і прамыя адсылкі ў тэксце да *Сказа пра Лысую гару*, але і форма (Я4, катрэн abab) – зрэшты, у гэтай жа канвенцыі напісаная арыгінальная расійская паэма *Лука Мудищев*, безумоўна, вядомая беларускаму чытачу ў 1980-х – 1990-х гг. Увагі заслугоўвае адзін з працягаў беларускай версіі *Лукі Мудзішчава...*, таксама ананімны – *Адказ Лукі Мудзішчава Ведзьмаку Лысагорскаму*, дзякуючы якому ў кантэксце жанравага кантынууму БТП з’яўляецца трасянка – крэольская мова жыхароў Беларусі:

І хваціт вам крычаць пра мову!
Ва мне вапрос так не стаіт.
Тот, хто січас доіт карову,
Пусьць хоць іўрытам гаваріт
(*Luka Mudziščaй adkazvae Vedz'maku Lysagorskamu*, 2014).

### *2.5. Зянон-хоп*

Так выглядала гісторыя бурлескна-травестыйнага жанру ў беларускай літаратуры, калі ў студзені 2007 г. у інтэрнэце была апублікаваная ананімная паэма *Зянон-Хоп*. Акаўнт livejournal.com, дзе адбылася публікацыя паэмы, быў выдалены стваральнікам праз тыдзень пасля публікацыі, аднак да таго часу

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



паэма займела „вірусны" характар: разышлася ў інтэрнэце і стала вядомай самаму шырокаму колу беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў, заангажаваных у сацыяльна-палітычныя падзеі таго часу.

Героем паэмы *Зянон-Хоп* выступаў тагачасны лідар партыі КХП БНФ Зянон Пазняк – беларускі культурны і палітычны дзеяч, які з 1996 г. знаходзіцца ў эміграцыі, аднак актыўна ўдзельнічае ў грамадскіх дыскусіях і ў тым ліку выказваецца з нагоды ўнутранай сітуацыі ў Беларусі.

Паводле сюжэту паэмы *Зянон-Хоп*, на фоне дэпрэсіі, якая ахапіла ўсе слаі насельніцтва ў 2006 г., Зянон Пазняк вяртаецца ў Беларусь, нелегальна перайшоўшы беларускую мяжу са зброяй, ладзіць крывавую бойню на мытні, вызваляе з „зоны" свайго паплечніка Паўла Севярынца, жорстка карае беларускіх апазіцыйных палітыкаў, якія прайгралі выбары, і крытыкуючы „негвалтоўны супраціў" беларускай грамадскай супольнасці, уздымае на бунт усе слаі насельніцтва, у тым ліку студэнтаў і рабочых. Пасля капітуляцыі рэжыма Зянон робіцца прэзідэнтам дзяржавы „Вялікае Княства Літоўскае-Беларусь" і пачынае танкавы наступ з мэтай захопу Вільні – цяперашняй сталіцы Літвы, былой сталіцы агульнай беларуска-літоўскай дзяржавы (*Zianon-hop*, 2007).

*Зянон-Хоп* – адметны твор з рысамі постмадэрнізму, які спалучае ў адным тэксце адсылкі адразу да некалькіх жанраў. Перш за ўсё гэта верш, створаны ў канвенцыі хіп-хопу. Форму паэмы мы вызначаем як квазі-рэп. Паводле дэфініцыі, „рэп – гэта паэзія, якая гучыць" (Bradley & DuBois, 2010, p. XXX), а *Зянон-Хоп* існуе толькі ў пісьмовым выглядзе, і з 2007 г. не адбылося ніводнай вядомай нам спробы яго агучыць.

У фармальным плане тэкст *Зянон-Хопа* спалучае лагаэд і акцэнтны верш (памеры, якія часта выкарыстоўваецца ў фармаце „рэп-батл" або „фрыстайл"), мае рыфмоўку (aabbccdd...) і іншыя прыёмы вершавання, якія актыўна эксплуатуюцца „эмсі" – рэп-паэтамі, што ствараюць тэксты на розных мовах свету. Паэма мае падзел на куплеты і рэфрэны. Яе пачатак адпавядае класічнаму зачыну кампазіцыі ў канвенцыі хіп-хопу – мае месца самапрэзентацыя эмсі („Волат Зміцер"), вызначэнне часу і месца дзеяння („ВКЛ Беларусь, Минск, Центр Европы").

Іншыя сучасныя жанры, да якіх адсылае *Зянон-Хоп*, бытуюць па-за літаратурай. Гэта, па-першае, класічны амерыканскі баявік, пародыяй на які абумоўленыя ўсе крывавыя сцэны паэмы: „гінуць" памежнікі, афіцыйныя тэлежурналісты („контуры Аверкова на асфальте мелом"), байцы АМАП і нават машыністы мінскага метрапалітэна. Умоўна можна аднесці да поп-культуры і алюзію на серыю кніг пра „Гары Потэра": вярнуўшыся ў Беларусь, Зянон склікае сваіх паплечнікаў, націскаючы на татуіроўку з гербам Пагоня – такім чынам праводзіцца паралель паміж беларускімі кансерватарамі і „паядальнікамі смерці" з кніг Джаан Роўлінг:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



Он вернулся, осмотрелся, на колени встал в Гродно,
Поцеловал родную землю, вздохнул свободно:
”Я вярнуўся”.
И это не пустые тёрки.
Он вернулся, почувствовал каждый четвёртый
Боль в татуировке на правом плече,
Шепча: „Ён вярнуўся: „Пагоня” пячэ” (*Zianon-hop*, 2007).

*Зянон-Хоп* напісаны на рускай мове, але дзякуючы прыёму цэнтанізацыі ў тэкст трапіла шмат цытат па-беларуску: *„цуд некранутай прыроды”* (фраза з сацыяльнай рэкламы), *„Дзень (...) добры ў хату”* (фальклорны зачын), *„Радзіма! Свабода!”, „Жыве Беларусь!”* – лозунгі з мітынгаў1990-х – 2000-х і інш. Сустракаюцца цытаты з класічнай літаратуры, перадусім – з верша Максіма Багдановіча „Пагоня” (*„БНФ не разбіць, не спыніць, не стрымаць”*). Іншая моўная асаблівасць паэмы – насычанасць рускай і англійскай абсцэннай лексікай, што з аднаго боку ёсць адсылкай да паэтыкі амерыканскага рэпу, а з іншага – „зніжальным” кодам: амаль заўсёды падобная лексіка інкруставаная ў беларускія цытаты або рыфмуецца з імі.

Можна ўспрыняць гэты факт як пародыю на беларускамоўны рэп, нешматлікія прадстаўнікі якога (Аляксандр Памідораў, Кроў, Вінцэнт) у пачатку 2000-х працавалі хутчэй у эстэтыцы традыцыйнай беларускай паэзіі, з яе своеасаблівым „узнёслым стылем”, выкарыстоўваючы рэп-рэчытатыў толькі як форму падачы тэксту. Аўтар *Зянон-Хопа* выводзіць свой твор з традыцый амерыканскага рэпу, пра што сведчыць адзін з рэфрэнаў, напісаны на эбоніксе – мове амерыканскіх „чорных гета”:

A.G.L.
You gonna get da sack
Zianon is here, Zianon is back!
Gonna run and duck,
gonna catch a slug
Nevah fuck
wit Zianon Pazniak! (*Zianon-hop*, 2007).

І разам з тым, нягледзячы на выкарыстанне ананімным аўтарам рускай мовы як асноўнай, а таксама прыёмаў і жанраў, характэрных для глабалізаванай і кібернізаванай культуры XXI ст., паэму *Зянон-Хоп* мы разглядаем як частку жанравага кантынууму БТП ў беларускай літаратуры. Верагодна, наследаванне гэтай традыцыі не было ўсвядомленым аўтарскім намерам, але нельга не адзначыць несумненныя тыпалагічныя паралелі „Зянон-Хопа” з БТП папярэдніх эпох.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



## 3. Фармальныя асаблівасці жанравага кантынуума БТП

Мы сістэматызавалі звесткі пра тэксты з жанравага кантынуума БТП у *Табліцы 1*, каб вылучыць асноўныя рысы БТП як знакавага жанру беларускай літаратуры.

### *3.1. Ананімнасць*

Асноўная рыса беларускіх БТП як жанру – ананімнасць. Фактычна ўсе даследчыкі або крытыкі *Энеіды...*, *Тараса...* і *Сказу...* ды іншых падобных твораў называюць ананімнасць характэрнай і нават унікальнай жанравай асаблівасцю беларускіх травестый (Kavalenka, 1975; Kisâlëŭ, 1993). Як зазначае Сяргей Дубавец:

> Не ведаю, ці ёсць на свеце іншая літаратура, дзе б такое месца займалі ананімныя паэмы. Зразумела, у часы тыраніі і супрацiву сатырычныя або саркастычныя вершы пісаліся і пішуцца паўсюль. Але каб ананімныя творы траплялі ў хрэстаматыі, а невядомыя аўтары станавіліся класікамі – такое, бадай, ёсць толькі ў нас, у Беларусі. Сам момант ананімнасці прымаецца ў нас часта як дадатковая вартасць твора (Dubavec, 1997).

Вылучаюць некалькі тыпаў ананімнасці ў залежнасці ад жанру. Так, ананімнасць беларускіх гутарак у некаторым сэнсе карэлюе з *фальклорнай ананімнасцю*, але не тоесная ёй, паколькі „аўтар свядома сцвярджае і ўвасабляе ў творы народны погляд на свет, прычым робіць гэта нават падкрэслена” (Kavalenka, 1975, s. 113). Наступнай, паводле В. Каваленкі, ступенню, „больш высокай формай усведамлення народнасці”, сталі сялянскія псеўданімы беларускіх класікаў шляхецкага паходжання: „Яська Гаспадар з-пад Вільні” – Кастусь Каліноўскі; „Мацей Бурачок” і „Сымон Рэўка з-пад Барысава – Францішак Багушэвіч; Цётка – Алаіза Пашкевіч і інш. Як можна заўважыць, літаратурная маска, якую стварае аўтар Зянон-Хопа – эмсі „Волат Зміцер” – гэта гульня з беларускай літаратурнай традыцыяй „сялянскіх масак”, да чаго падштурхоўвае сам жанр рэпу, якому ў яго аўтэнтычных праявах уласцівая сацыяльная вастрыня і палітызаванасць. Эмсі – гэта таксама „хлопец з народу”, рупар соцыуму, чыімі вуснамі фармулююцца настроі мас. У гэтым кантэксце, паводле нашых назіранняў, важнае значэнне мае слова, абранае для псеўданіма. Калі беларускія аўтары XIX–XX стст. выкарыстоўвалі адсылкі да сялянскага побыту (Гаспадар, Лучына, Каганец), аграрнай тэматыкі (Колас, Бурачок), прыродных матываў (Чарот, Верас, Крушына, Вярба), абраднасці (Купала, Дудар), мелі канатацыі свойскасці (Цётка, Сваяк) і г.д., то аўтар XXI ст. звяртаецца да слова з эпічнымі канатацыямі (Волат), парадзіруючы ўжо рыторыку нацыянальнага адраджэння 1990-х гг.

Адметна, што псеўданім аўтара „Сказа пра Лысую Гару” травестуе гэтую традыцыю „сялянскіх масак”, бо сканструяваны па мадэлі шляхецкіх прозвішчаў –

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



Табліца 1. Жанравы кантынуум беларускай ананімнай бурлескна-травестыйнай паэмы ў XIX–XXI стст.

| 1. Назва твора | 2. Аўтар | 3. Час і месца напісання | 4. Фармальныя характарыстыкі | 5.Узоры пераймання | 6. Стары / высокі код | 7. Новы / нізкі код | 8. Цыркуляванне | 9. Першапублікацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *Энеіда навыварат* | ананімны / невядомы Смаленскі памешчык Вінцэнт Равінскі (1786–1855) | Паміж 1812 [1820-я] –1837, у ваколіцах Смаленска | Сапсаваная дэцыма (М. Хаўстовіч,) (ababccdeed – abab (...) deed і іншыя камбінацыі) → Я4 | – *L'Eneide travestita del Signor Gio* Джаванні Батыста Лалі (1633), Італія<br>– *Le Virgile travesti en vers burlesques* Поля Скарона (1649–1652), Францыя →<br>– *Елисей, или Раздражённый Вакх* Васілія Майкава (1769), Расія /<br>– *Virgils Aeneis travestirt* Алаіза Блюмаўэра (1780-я), Аўстрыя →<br>– *Вергилиева Энеида, вывороченная наизнанку, шутливым слогом* Мікалая Осіпава (1791–1796), Расія /<br>– *Енеїда* Івана Катлярэўскага (1798) | Паэтыка позняга класіцызму як увасабленне эстэтыкі Расійскай імперыі | Штодзённыя практыкі сялянства, беларускі фальклор і звычаі, смаленскі дыялект беларускай мовы (дамінанта) | Усходняя Беларусь; Захад Расійскай Імперыі, пераважна вусна, цягам усяго XIX стагоддзя. | „Маяк", СПб 1845;<br>„Смоленский вестник" 1853 (урыўкі)<br>„Смоленский вестник"<br>1890 цалкам, публікатар К. Равінскі) |
| *Тарас на Парнасе* | ананімны / невядомы (Канстанцін Вераніцын (1834–2009), аграном з Віцебшчыны). | 1855, Гарадок | Я4, катрэн abab, твор разбіты на 15 частак. | – *Енеїда* Івана Катлярэўскага (1798)<br>– *Энеіда навыварат*<br>– Расійская літаратурная палеміка („Северная пчела" vs В. Белінскі) | Кола рэакцыйных пісьменнікаў як увасабленне ідэалогіі Расійскай імперыі (М. Грэч, Ф. Булгарын) | Штодзённыя практыкі сялянства, беларускі фальклор і звычаі, віцебскі дыялект беларускай мовы; прагрэсіўная літаратурная крытыка Расійскай імперыі (В. Белінскі) (дамінанта) | Усходняя Беларусь; Захад Расійскай Імперыі, вусна і ў рукапісах у другой палове XIX стагоддзя. | 1889<br>у Віцебску |

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *Сказ пра Лысую гару* | ананім / Францішак Вядзьмак-Лысагорскі З 2003 г. – Ніл Гілевіч (1935–2016), магчыма, у суаўтарстве з Міколам Аўрамчыкам (1920–2017). | 1971–1975; 1980–другая рэдакцыя | Я4, катрэн abab. Паэма мае на 5 раздзелаў (*Дзяльба*, *Праблема*, *Будаўніцтва*, *Так і зажылі*, *Замест эпілога*) | – *Тарас на Парнасе*<br>– Сатырычныя жанры савецкай літаратуры | Сацыяльны рэалізм як афіцыйная канвенцыя беларускай літаратуры ў 1945–1991; Канцэпцыя „новай эліты" (дамінанта) | Штодзённыя практыкі беларускіх пісьменнікаў, якія атрымалі дачы ў пасёлку ля Лысай Гары | Мінск → уся Беларусь → Беларускія суполкі Масквы, Ленінграда/ Украіна, у машынапісах („самвыдаў"), | 1988 у серыі *Бібліятэка „Вожыка"* (Выдавецтва ЦК КПБ, Мінск) |
| *Лука Мудзішчаў – прэзідэнт* | ананімны / *Вядзьмак Лысагорскі* / | 1994 (пачатак беларускай „лукіяны" 1990-х) | Я4, катрэн abab. | – *Сказ пра Лысую Гару*<br>– *Лука Мудищев* (ананімная „срамная" паэма XIXст, якую прыпісвалі Івану Баркову) | – Нацыянальнае адраджэнне 1980–1990,<br>– Беларуская мова (дамінанта) | – Шаржыраваны вобраз беларускага палітыка<br>– Трасянка | Уся Беларусь і беларускацэнтрычныя асяродкі свету, праз газету „Свабода", у ксеракопіях, пазней – глабальна, у інтэрнэце | 27.12.1994, газета „Свабода". |
| *Званон-Хоп* | Ананімны / „эмсі Волат Зміцер" | Студзень 2007 | квазі-рэп (лагаэд, акцэнтны верш) | – Амерыканская хіп-хоп паэзія<br>– Галівудскія фільмы катэгорыі В<br>– Беларускія культурныя клішэ<br>– Кнігі і фільмы пра Гары Потэра<br>– Падзеі ў Мінску сакавіка 2006 года | – Нацыянальнае адраджэнне 1980-х –1990-х, ідэалагічная праграма палітычнай партыі КХП–БНФ<br>– Беларуская мова | – Шаржыраваны вобраз беларускага палітыка<br>– Глабальная мас-культура<br>– Руская мова<br>– Эбонікс – мова чарнаскурых жыхароў ЗША<br>– Абсцэнная лексіка (дамінанта) | Глабальна, у інтэрнэце | Інтэрнэт-публікатар pod_koksom. livejournal.com („Тиханович под коксом"), студзень 2007 |

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



Францішак Вядьмак-Лысагорскі. У выніку народнага бытавання паэмы псеўданім спрасціўся: аўтара сталі называць па „сялянскай мадэлі” – „Вядзьмак Лысагорскі”, што засмуціла Н. Гілевіча, які псеўданім прыдумаў (Gilevič, 2007, s. 290).

Кажучы пра ананімныя творы, даследчыкі адрозніваюць *канвенцыйную (прынцыповую)* і *неканвенцыйную (выпадковую) ананімнасць* (Кісялёў, 1993). Важна зразумець, свядома аўтар хаваў сваё прозвішча, або яно страцілася выпадкова. Г. Кісялёў сцвярджае, што стваральнікі *Энеіды навыварат* і *Тараса на Парнасе* не хавалі свайго аўтарства ад сяброў і знаёмых, а імёны згубіліся толькі праз папулярнасць паэм і іх шматразовае перапісванне. Аднак, на нашу думку, ужо вывучэнне біяграфіі К. Вераніцына абвяргае гэтую тэзу. Літаратар напісаў паэму ў 1855 г., а памёр у 1904 г. Ён не мог не ведаць пра папулярнасць уласнага твора, пра яго шматлікія публікацыі, але не заявіў пра аўтарскія правы. Боязь палітычнага пераследу за выданне кніг на беларускай мове магла быць адной з прычын маўчання аўтара, але, напрыклад, боязь цэнзуры не спыніла І. Катлярэўскага, які аднавіў аўтарскія правы на паэму пасля яе несанкцыяванага выдання ў 1798 г.

З гэтага робім выснову, што ананімнасць беларускіх БТП – гэта *канвенцыйная, прынцыповая ананімнасць*. Тут варта казаць пра „аўтарскую сціпласць”, якая не абавязкова азначае сціпласць аўтара як асобы і мае шмат агульнага з ананімнасцю аўтарскіх гутарак, калі пісьменнік свядома выступае „асобай масавай, такой, як усе”. Часткова прычынай такой „сціпласці” мог быць страх палітычнага пераследу (Н. Гілевіч заявіў пра аўтарства праз 12 год пасля развалу СССР, калі палічыў гэта дастаткова бяспечным, а магчыма, падводзячы вынікі жыцця). Яшчэ адна прычына ананімнасці – сітуацыя каланіялізму. У XIX ст. творчасць на беларускай мове не ўспрымалася сур’ёзна самімі аўтарамі ананімных травестый, якія лічылі ўзорам расійскую культуру. Не апошнюю ролю ўва ўсе часы граў *містыфікацыйны аспект*: ананімнасць – гульня з чытачом, адзін са сродкаў прыцягнуць увагу да твора, стварыць інтрыгу.

### *3.2. Віруснасць і варыятыўнасць*

Вірусны характар цыркуляцыі – наступная яскравая рыса БТП. Аўтар *Зянон-Хопа* стварыў свой твор у эпоху інтэрнэту, калі ананімнасць ёсць адной з галоўных рыс камунікацыі. Тым не менш, у сваім жаданні застацца невядомым ён не адрозніваецца ад сваіх літаратурных папярэднікаў. Ананімнае існаванне *Зянон-Хопа* лёгка трасіруецца з дапамогай запытаў у пошукавіках. Па законах медыялізацыі *Зянон-Хоп* атрымаў „вірусны” распаўсюд (цягам аднаго месяцу ў 2007 г.). Для параўнання, копіі *Сказа пра Лысую Гару*, напісанага ў Мінску, каля году дабіраліся да рэгіёнаў Беларусі. Адпаведна, разам з хутка задаволенай цікаўнасцю, хутчэй згасла ўвага да *Зянон-Хопа*. Рэтранслятары ананімнай інтэрнэт-паэмы выкарыстоўваюць функцыю „copy-paste”, што

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



выключае памылкі прачытання, якія ў дакамп'ютарную эпоху часта скажалі тэксты ананімных твораў да непазнавальнасці[2]. І тым не менш, у інтэрнэце існуе некалькі версій *Зянон-Хопа*, у тым ліку яго беларускі пераклад. Адсутнасць аўтарскага дыктату надае чытачу смеласць мяняць тэкст адпаведна сваім густам. Так, у газеце „Свабода" пры перадруку тэксту ў лютым 2007 г., абсцэнную лексіку замянілі купюрамі: „Адзінае ўмяшанне, на якое з вядомых прычынаў вымушаная была пайсці рэдакцыя, – гэта замена некаторых літар на шматкроп'е" (*Zianon-hop*, 2007, s. 5).

Такім чынам, варыятыўнасць як прамое наступства ананімнасці – трывалая рыса амаль усіх разгляданых намі БТП.

### *3.3 Гратэскавасць і палітычнасць*

Уключэнне твора ў жанравы кантынуум БТП дазваляе казаць пра гратэск як вядучы пафас *Зянон-Хопа*.

Трэба разумець, што аўтары ўсіх травеставаных *Энеід*, скажаючы класічны тэкст Вергілія, бачылі ў ім увасабленне старога, але кожны пад гэтым „старым" меў розныя – даволі канкрэтныя рэчы. Прыўносячы ў свае творы новы – кантрасны, „нізкі" матэрыял, аўтары гэткім чынам фармулявалі свайго роду сацыяльную замову на новых актараў гісторыі. Як паэмы аўстрыяка Блюмауэра і ўкраінца Катлярэўскага былі своеасаблівым прадказаннем „Вясны народаў" сярэдзіны XIX ст. у Сярэдняй Еўропе, так *Сказ пра Лысую Гару* рэагаваў на сацыяльна-культурную атмасферу часоў СССР Леаніда Брэжнева. Як зазначае Таццяна Астроўская:

> Гратэскава намаляваная [...] пагоня за лецішчамі, якая ахапіла асяроддзе творчай інтэлігенцыі, была больш чым толькі прымальнай крытыкай асобных яе заганаў [...]. Разладдзе і крызіс (няхай і перабольшаныя аўтарам) у творчым саюзе, справакаваныя ўварваннем быту ў сферу культуры, прымушаюць задаваць пытанні аб устойлівасці механізмаў яе функцыянавання (Astroŭskaâ, 2022, s.169).

Травеставаны вобраз пакліканы вывесці на сцэну новага героя ў старой вопратцы. Беларускі шляхціц Эней мусіць стаць новым, справядлівым царом. Пры ўсёй эпатажнасці *Зянон-Хопа*, у ім нельга не пабачыць пэўную сацыяльную замову маладзейшага пакалення беларусаў на „тэму моцнай рукі", як абазначыла гэта Ганна Кісліцына (*Što vy dumajecie pra ananimnuji paemi Zianon-Chop*, 2007).

Такім чынам, гратэскавасць БТП арганічна спалучаная з іх палітычнасцю.

[2] Сяржук Сыс згадвае, як чытаў *Сказ пра Лысую Гару*, перадрукаваны асобай, якая яўна не ведала беларускай мовы (інф. аўт.).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



### *3.4. Амбівалетнасць і метаіранічнасць*

Амбівалентнасць – важная і абавязковая рыса беларускага варыянту БТП. Для прыкладу, аб’ект травестацыі ў *Зянон-Хопе* – палітык Зянон Пазняк – гэта, паводле выразу Міхаіла Бахціна, „два целы ў адным” (Bahtin, 2010, s. 36). З аднаго боку, гэта міфалагізаваны ўжо вобраз палітычнага дзеяча (да 2007 г. Пазняк ужо 10 гадоў знаходзіўся ў эміграцыі, і маладзейшае пакаленне жыхароў Беларусі не бачыла яго ўжывую). З другога боку, гэта пастыжаваны вобраз супергероя з маскультуры: ён адзіны можа ўратаваць свет, які ў кантэксце паэмы лакалізуецца да Беларусі. Нездарма першыя ахвяры супергероя Зянона, калі ён прыбывае ў Мінск – іншыя дзеячы беларускай апазіцыі, для кожнага з якіх у аўтара знаходзіцца слоўная абраза (што карэлюе з рытарычным прыёмам рэпу, вядомым як „дыс” – ад анг. disgrace – знявага). Адсутнасць моцнага, харызматычнага апазіцыйнага лідара ў Беларусі – адна з самых дыскутаваных праблем пачатку XXI ст. у Беларусі, і, верагодна, народная папулярнасць гратэскавага Зянона-супермэна мела на мэце паказаць беларускім палітыкам часу стварэння паэмы, што праблема гэтая як ніколі надзённая.

Два полюсы паэмы, змяшаныя ў вобразе Зянона, таксама адсылаюць да маштабнай светапогляднай дыскусіі, якая адбываецца ў свеце, і Беларусь тут – не выключэнне. У *Зянон-Хопе* ў гратэскавым ключы супрацьпастаўляецца кансерватыўная і ліберальная рыторыка: кансерватыўнаму коду адпавядае беларуская мова, палітычныя лозунгі апазіцыі 1990-х – 2000-х, цытаты з класічнай літаратуры. У дыхатаміі жанравага кантынууму БТП гэта адпавядае „старому”, „высокаму”. Ліберальны код – гэта выкарыстанне рускай мовы, мата, грубай лексікі, вобразаў мас-культуры: „новае”, „нізкае”. У масавым функцыянаванні травестыйных паэм „стары” код з часам маргіналізаваўся (гл. слупкі 6 і 7 Табліцы 1), дамінантным рабіўся „новы” код, і травестыя ў выніку пераставала ўспрымацца як травестыя[3]. Метаіронія такім чынам – поруч з гратэскам – абавязковы пафас жанравага кантынуума БТП.

## Заключэнне

Такім чынам, жанр БТП у беларускай літаратуры існуе ўжо два стагоддзі, а тэксты ў гэтым жанры ўтвараюць своеасаблівы жанравы кантынуум. Адметна, што, нягледзячы на бытаванне таго ці іншага тэксту ў светапогляднай сістэме свайго часу, яны заставаліся інертнымі да літаратурных уплываў, будучы з аднаго боку – прадуктам сацыякультурнай сітуацыі, а з іншага інварыянтам

[3] Калі браць да ўвагі гіпотэзу М. Хаўстовіча, адзін з доказаў гэтаму ─ „сапсаваны” тэкст *Энеіды навыварат*, дзе падчас перапісвання, дэградавала адычная страфа.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



агульнага жанру. Паэма *Зянон-Хоп* – невідавочны твор у жанры БТП – эксплуатуе характэрную беларускай літаратуры 2000-х постмадэрнісцкую паэтыку і эстэтыку, але па сутнасці належыць да таго ж жанравага кантынууму. Як і ў XIX ст., у XXI ст. гратэск застаецца дзейсным рытарычным прыёмам утылізацыі старога мыслення і зацвярджэння новага, хіба што ў наш час, калі посмадэрн як светапогляд імкліва замяняецца метамадэрнам, гратэскавасць БТП выступае поруч з метаіроніяй, калі іранічны пафас невідавочны і твор можа быць прачытаны як сур’ёзны, патэтычны. У сілу сваёй амбівалентнай будовы, беларускія БТП ад самага пачатку існавання гэтага жанру ў беларускай літаратуры XIX–XXI ст. адыгрывалі важную ролю ў яе развіцці, служачы каталізатарам змены культурнай парадыгмы, канстатуючы важныя змены ў карціне свету інтэлектуальных элітаў Беларусі, адпрэчваючы герояў мінулага і / або вітаючы новых герояў.

Прааналізаваўшы БТП беларускай літаратуры XX ст. па стандартызаванай схеме, можна вылучыць такія рысы іх паэтыкі як ананімнасць, віруснасць, варыятыўнасць, гратэскавасць, палітычнасць, амбівалентнасць і метаіранічнасць. Узятыя разам, гэтыя рысы аддаляюць жанравы кантынуум БТП ад сатыры, набліжаючы яго да гратэску, пародыі, незласлівага карнавальнага смеху, што, на нашу думку, з’яўляецца важным удакладненнем для разумення прыроды разгледжаных намі твораў – і ў прыватнасці хрэстаматыйных бурлескаў *Энеіда навыварат* і *Тарас на Парнасе*, з якіх фактычна пачалася новая беларуская літаратура.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Aleksandrovìč, Scâpan, i in. (red.). (1971). *Belaruskaâ litaratura XIX stagoddzâ: Hrèstamatyâ*. Minsk: Vyšèjšaâ škola. [Александровіч, Сцяпан, і інш. (рэд.). (1971). *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя*. Мінск: Вышэйшая школа].

Anderson, Benedict. (2006). *Imagined Communities: Reflection on the Origin and Spread of Nationalism*. London–New York: Verso.

Astroŭskaâ, Taccâna. (2022) *Kul'tura i supracij. Intèligencyâ, inšadumstva i samvydat u savec-kaj Belarusi (1968–1988)*. Belastok: Èkaprès. [Астроўская, Таццяна. (2022) *Культура і супраціў. Інтэлігенцыя, іншадумства і самвыдат у савецкай Беларусі (1968–1988)*. Беласток: Экапрэс].

Bahtin, Mihail. (2010). *Sobranie sočinenij*, t. 4(2). Moskva: Russkie slovari. Âzyki slavânskoj kulʹtury. [Бахтин, Михаил. (2010). *Собрание сочинений*, т. 4(2). Москва: Русские словари. Языки славянской культуры].

Barkov, Ivan. (1969). *Luka Mudiŝev*. London: Flegon press. [Барков, Иван. (1969). *Лука Мудищев*. Лондон: Флегон пресс].

Bradley, Adam; DuBois, Andrew. (2010). *The Anthology of Rap*. New Haven: Yale UP.

Čamu Lukašènka baicca svabodnaj prèsy. (1995). *Svaboda: Belaruskaâ gazeta,* 2/101, s. 1. [Чаму Лукашэнка баіцца свабоднай прэсы. (1995). *Свабода: Беларуская газета* 2/101, с. 1].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



Dubavec, Sârgej. (1997). *Ananimnyâ paèmy kanca stagodz'dzâ.* [Дубавец, Сяргей. (1997). *Ананімныя паэмы канца стагодзьдзя*]. Pobrano z: https://www.svaboda.org/a/24866843.html (dostęp: 03.05.2024).

Gilevič, Nil. (2003). *Skaz pra Lysuû Garu*. Minsk: Belfrans. [Гілевіч, Ніл. (2003). *Сказ пра Лысую Гару*. Мінск: Белфранс].

Gilevič, Nil. (2007). *Zbor tvoraй u 23-h tamah*, t. 5: *Litaraturnyâ mistyfikacyi*. Vil′nâ: Naša Budučynâ. [Гілевіч, Ніл. (2007). *Збор твораў у 23-х тамах*, т. 5: *Літаратурныя містыфікацыі.* Вільня: Наша Будучыня].

Haŭstovič, Mikalaj. (2004). „Èneida navyvarat": sproba rèkanstrukcyi. W: Mikalaj Haŭstovič (rèd.). *Pracy kafedry gistoryi belaruskae litaratury Beldzâržuniversitèta: Navukovy zbornik*, t. 5. Minsk: Prava i èkanomika. [Хаўстовіч, Мікалай. (2004). „Энеіда навыварат": спроба рэканструкцыі. У: М. Хаўстовіч (рэд.). *Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта: Навуковы зборнік*, т. 5. Мінск: Права і эканоміка].

Kavalenka, Viktar. (1975). *Vytoki. Uplyvy. Paskoranasc'. Razviccë belaruskj litaratury XIX–XX stagoddzâй.* Minsk: Navuka i tèhnika. [Каваленка, Віктар. (1975). *Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускй літаратуры XIX–XX стагоддзяў*. Мінск: Навука і тэхніка].

Kisâlëŭ, Genadz′. (1993). *Ad Čačota da Bagušèviča: Prablemy krynicaznaŭstva i atrybucyi belaruskaj litaratury XIX st*. Minsk: Narodnaâ asveta. [Кісялёў, Генадзь. (1993). *Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст.* Мінск: Народная асвета].

*Luka Mudziščaй adkazvae Vedz'maku Lysagorskamu*. (2014). [*Лука Мудзішчаў адказвае Ведзьмаку Лысагорскаму*]. Pobrano z: https://knihi.com/Francisak_Viadzmak-Lysahorski/Luka_Mudziscau_-_Prezydent.html (dostęp: 27.09.2023).

Pavlìčko, Solomìâ. (2002). *Teorìâ lìteraturi*. Kiïv: Osnovi. [Павличко, Соломія. (2002). *Теорія літератури*. Київ: Основи].

Ragojša, Vâčaslaŭ. (2009). *Litaraturaznaŭčy sloŭnik: Tèrminy i panâcci*. Minsk: Narodnaâ asveta, 2009. [Рагойша, Вячаслаў. (2009). *Літаратуразнаўчы слоўнік: Тэрміны і паняцці*. Мінск: Народная асвета, 2009].

Ragojša, Vâčaslaŭ. (2004). *Paètyčny sloŭnik*. Minsk: Belaruskaâ navuka. [Рагойша, Вячаслаў. (2004). *Паэтычны слоўнік*. Мінск: Беларуская навука].

Sokolova, Valentina. (2011). Eŝe raz ob istokah poèmy „Taras na Parnase". W: Ivan Čarota (rèd). *Matèryâly X Mižnarodnaj navukovaj kanferèncyi „Slavânskiâ litaratury ŷ kantèkscе susvetnaj" (Minsk, 6–8 kastryčnika 2011 g.)*. Minsk: Vydavecki cèntr BDU. [Соколова, Валентина. (2011). Еще раз об истоках поэмы „Тарас на Парнасе". У: Іван Чарота (рэд). *Матэрыялы X Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай" (Мінск, 6–8 кастрычніка 2011 г.)*. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ].

Što vy dumajecie pra ananimnuju paemu Zianon-Chop (2007). *Svaboda: Bielaruskaja hazieta*, 5/54, s. 2. [Што вы думаеце пра ананімную паэму Зянон-Хоп (2007). *Свабода: Беларуская газета*, 5/54, с. 2].

*Ugolovnyj kodeks Respubliki Belarus'*. (1999). [*Уголовный кодекс Республики Беларусь*]. Pobrano z: https://zakony-by.com/ugolovnyj_kodeks_rb.htm (dostęp: 03.05.2024).

Vâdz′mak Lysagorski. (1994). Luka Mudziščaŭ – prèzidènt. *Svaboda: Belaruskaâ gazeta*, 49. [Вядзьмак Лысагорскі. (1994). Лука Мудзішчаў – прэзідэнт. *Свабода: Беларуская газета*, 49].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 14/07/2026 01:36:57



Vâdz′mak Lysagorski. (1988). *Skaz pra Lysuû Garu: Paèma*. Minsk: vydavectva CK KPB. [Вядзьмак Лысагорскі. (1988). *Сказ пра Лысую Гару: Паэма*. Мінск: выдавецтва ЦК КПБ].

Zianon-hop. (2007). *Svaboda: Belaruskaâ gazeta*, 5/54, s. 5–7. [Зянон-Хоп. (2007). *Свабода: Беларуская газета*, 5/54, с. 5–7].

SUBMITTED: 2024.05.18
ACCEPTED: 2024.10.28
PUBLISHED ONLINE: 2025.01.08

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Maryia Martysevich / Марыя Мартысевіч** – Białoruś, Mińsk, Narodowa Akademia Nauk Białorusi, Centrum Badań Kultury, Języka i Literatury Białoruskiej; doktorantka, mgr.; *specjalność:* teoria literatury, *zainteresowania naukowe:* synkretyczne gatunki poetyckie.

*Adres*: вул. Чарнышэўскага 14-60, Мінск, 220013, Беларусь

*Wybrane publikacje:*

1. Мартысевіч М. (2008). „Антычны код" сучаснага беларускага верша. *Роднае слова, 5,* с. 7–10.
2. Мартысевіч М. (2007) „Тут, на памежжы": музычны праект „Narodny albom" як літаратурны феномен. У: Светлана Гончарова-Грабовская (ред.). *Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв.: сборник научных статей: в 2 ч.*, ч. 2 (с. 82–87). Минск: РИВШ.
3. Мартысевіч, М. (2007). Сучасная беларуская паэзія ў святле тэхнічнага прагрэсу: асаблівасці паэтыкі. У: Васіль Рагаўцоў (рэд.). *Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 26–27 красавіка 2007 г.* (с. 47–49). Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова.
4. Мартысевіч М. (2006). Фармальныя мадыфікацыі ў сучаснай беларускай сістэме вершавання. *Веснік БДУ, Серыя 4,* 3, с. 15–19.
5. Мартысевіч М. (2006). Паміж літаратурай і фальклорам: маргінальны статус жанра лімерыка. У: Таццяна Марозава, Вольга Прыемка (рэд.). *Фальклarыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт.*, Вып. 3 (с. 68–74). Мінск: Бестпрынт.